# Нашы юбіляры

## ВОЛЬГА ВАСІЛЬЕЎНА КАЗЛОВА
### (да 70-годдзя з дня нараджэння)



Цікавае і плённае жыццё Вольгі Васільеўны Казловай, дацэнта БДУ, заслужанага работніка вышэйшай школы, на працягу звыш пяцідзесяці гадоў непарыўна звязана з лёсам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У грозны 1943 год Вялікай Айчыннай вайны яна разам з невялікай групай дзяцей партызан Беларусі прыйшла вучыцца на станцыю Сходня пад Масквой, дзе тады мясціўся Беларускі універсітэт. З таго пакалення студэнтаў і выкладчыкаў цяжкага ваеннага часу атрымаліся цудоўныя грамадзяне рэспублікі.

Прафесар М. Р. Ларчанка адкрыў ёй — дачцэ славутага камандзіра партызанскага злучэння Героя Савецкага Саюза Васіля Іванавіча Казлова — шлях у навуку.

У 1948 г. Вольга Казлова скончыла філалагічны факультэт, затым вучылася ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры, а ў 1968 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. Дванаццаць гадоў яна плённа кіравала кафедрай беларускай літаратуры. За гэты час членамі кафедры была выдадзена і перавыдадзена шматлікая навуковая прадукцыя (падручнікі па беларускай літаратуры, манаграфіі, праграмы, артыкулы і інш.).

Сама Вольга Васільеўна ўдумлівы і сур'ёзны даследчык творчасці класікаў беларускай літаратуры, і найперш — Якуба Коласа. Творчасці народнага песняра прысвечана яе кандыдацкая дысертацыя. Вернасць і глыбокая навуковая зацікаўленасць да спадчыны Коласа не пакідае Вольгу Васільеўну і па сённяшні дзень. Аб гэтым сведчаць шматлікія публікацыі, курс лекцый, спецкурс і спецсемінар, распрацаваныя ёю.

Мастацкае ўвасабленне подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны — другая навуковая праблема, якую плённа распрацоўвае Вольга Васільеўна на матэрыяле творчасці Янкі Купалы, Янкі Брыля, Міхася Лынькова і іншых пісьменнікаў. Яна — адзін з аўтараў двухтомнай гісторыі беларускай савецкай літаратуры. У полі яе зроку таксама і праблемы методыкі выкладання беларускай літаратуры ў вышэйшай і сярэдняй школе. Вольга Васільеўна — аўтар метадычных дапаможнікаў па напісанню дыпломных і курсавых прац.

В. В. Казлова часта выступае з лекцыямі і гутаркамі па надзённых пытаннях літаратуразнаўства ў школах, музеях, на радыё і тэлебачанні. У практыку філалагічнага факультэта яна ўвяла выязныя пасяджэнні кафедры ў школах рэспублікі. Вольга Васільеўна садзейнічала адкрыццю школ, музеяў.«Шчырай рупніцай роднага слова, што не згіне нідзе», назваў яе Рыгор Барадулін у вершы «Вуліцай бацькі». Шмат гадоў гэтак жа рупна Вольга Васільеўна працавала вучоным сакратаром савета філалагічнага факультэта.

Вопыт В. В. Казловай ухвалены кіраўніцтвам Варшаўскага, Сафійскага, Іенскага універсітэтаў, дзе яна чытала курсы лекцый па гісторыі нацыянальнай літаратуры.

Вольга Васільеўна ўвесь час у пошуках новых, актыўных, дзейсных форм навучання, пазнання рэчаіснасці. Заняткі са студэнтамі яна, як правіла, праводзіць у сценах літаратурнага музея, у мемарыяльных мясцінах (Вязынка, Хатынь, Нясвіж, музеі Вялікай Айчыннай вайны, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча).

Навукова-педагагічная і грамадская дзейнасць В. В. Казловай адзначана шматлікімі ўзнагародамі: медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «За працоўную доблесць», «Ветэран працы», трыма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі.

Прырода надзяліла Вольгу Васільеўну рэдкімі якасцямі — заглянуць у душу чалавека, зразумець яго боль, падзяліць з ім радасць і гора, падтрымаць у цяжкую хвіліну.

Усе калегі па працы і шматлікія вучні шчыра віншуюць Вольгу Васільеўну з 70-годдзем з дня нараджэння і жадаюць ёй моцнага здароўя, новых творчых поспехаў і светлага шчасця.

З. Б. Варановіч